УДК 811.161.3:367.335

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ СІНТАКСІСУ ПРОСТАГА СКАЗА ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ НАВУЧЭНЦАЎ ДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ

**[1]Савіцкая І.У., канд. філал. навук, дацэнт,**
**[2]Пятрова Н.Я., канд. філал. навук, дацэнт**
*[1]Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*[2]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя: у артыкуле прааналізаваны некаторыя прыёмы работы над сінтаксісам простага сказа пры падрыхтоўцы абітурыентаў да цэнтралізаванага тэсціравання. Падкрэсліваецца, што сучасная методыка выкладання сінтаксісу арыентуецца на разгляд любой канструкцыі ў адзінстве значэння, моўных сродкаў яго выражэння і функцыі.

Ключавыя словы: сінтаксіс, словазлучэнне, сказ, просты сказ, граматычная аснова.

# FEATURES OF TEACHING THE SYNTAX OF A SIMPLE SENTENCE IN THE PREPARATION OF THE STUDENT TO CENTRALIZED TESTING

**[1]Savitskaya I.V., associate professor,**
**[2]Petrova N.E., associate professor**
*[1]Belarusian National Technological University*
*2Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics*
*Minsk, Republic of Belarus*

Summary: the article analyzes some methods of working on the syntax of a simple sentence in the preparation of students for centralized testing. It is emphasized that the modern methodology of teaching syntax focuses on the consideration of any construction and in the unity of meaning, means of expression and function.

Keywords: syntax, phrase, tale, simple sentence, grammatical basis.

Сучасная методыка выкладання беларускай мовы характарызуецца пошукамі такіх сродкаў і шляхоў навучання, якія б забяспечылі навучэнцам добрыя веды праграмы па беларускай мове і на іх аснове фарміраванне трывалых практычных навыкаў.

Што з’яўляецца найбольш важным у вывучэнні сінтаксісу простага сказа і з чаго пачаць яго вывучэнне пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання? Якія веды пра канкрэтныя сінтаксічныя паняцці павінны быць сфарміраваны ў навучэнцаў і якім павінен быць узровень іх тэарэтычных ведаў?

Вядома, што навучэнцы, якія рыхтуюцца да цэнтралізаванага тэсціравання, ужо дастаткова добра знаёмы з простым сказам: яны вывучалі яго ў пачатковай школе, паўтаралі ў сярэдніх класах, а таксама звярталіся да яго пры вывучэнні марфалогіі, вызначаючы сінтаксічную ролю той ці іншай часціны мовы. Таму разглядаць просты сказ як нейкую новую з’яву для іх няма падстаў. Неабходна шукаць такі шлях навучання, які паглыбляў бы веды і навыкі навучэнцаў у галіне сінтаксісу, развіваў іх мысленне і маўленне. Адсюль асновай пры вывучэнні простага сказа з’яўляецца структурна-семантычны падыход, згодна з якім ва ўсіх сінтаксічных з’явах выяўляюцца структурныя і семантычныя якасці.

Што маецца на ўвазе, калі размова ідзе пра вывучэнне структуры простага сказа? У першую чаргу, уважлівая работа над словазлучэннем, яго структурай і зместам. Важнейшай задачай выкладчыка пры вывучэнні словазлучэння з’яўляецца структурна-сінтаксічны аналіз сказа, разбіўка яго на асобныя словазлучэнні, высвятленне структуры кожнага словазлучэння, а таксама высвятленне сэнсавых і марфалагічных сувязей паміж словамі ў словазлучэнні.

Веданне асаблівасцей розных відаў сінтаксічнай сувязі слоў і іх формаў, якія выступаюць у розных спалучэннях і функцыях, дапамагае выкладчыку, з аднаго боку, папярэдзіць шматлікія памылкі ў маўленні навучэнцаў. З другога боку, працуючы такім чынам над словазлучэннем, выкладчык рыхтуе абітурыентаў да вывучэння наступных тэм сінтаксісу простага сказа.

У курсе сучаснай беларускай мовы ў якасці асноўных адзінак сінтаксісу лічацца словазлучэнне і сказ, аднак па аб’ёму матэрыялу і ўвазе да яго вывучэння цэнтральнай адзінкай сінтаксісу выступае сказ – тая найменшая сінтаксічная адзінка, дзякуючы якой мова

выконвае сваю функцыю як сродку фарміравання, выражэння і паведамлення думкі.

Вывучэнне простага сказа адбываецца наступным чынам. Спачатку разглядаюцца прыметы сказа: любы сказ характарызуецца інтанацыяй канца, наяўнасцю граматычнай асновы, сінтаксічных сувязей паміж кампанентамі сказа і пэўным парадкам іх размяшчэння, камунікатыўнай накіраванасцю. Кожная з гэтых прымет становіцца асновай для разгляду разнавіднасцей простага сказа. Так, напрыклад, у залежнасці ад мэты выказвання (камунікатыўная накіраванасць) адрозніваюць сказы апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя; у залежнасці ад інтанацыі паведамлення, пытання ці пабуджэння выдзяляюць клічныя і няклічныя сказы; па характары граматычнай асновы сказы дзеляцца на двухсастаўныя і аднасастаўныя; па наяўнасці толькі галоўных ці галоўных і даданых членаў – на неразвітыя і развітыя і г.д.

Пры вывучэнні тэмы "Галоўныя і даданыя члены сказа" больш часу неабходна адводзіць на вывучэнне састаўнога выказніка, бо звесткамі пра просты выказнік навучэнцы валодаюць у дастатковай ступені. Спачатку навучэнец павінен зразумець прызначэнне звязкі ў састаўным выказніку, для чаго карысна супаставіць дзеясловы, якія выкарыстоўваюцца ў ролі звязкі, з дзеясловамі, якія выступаюць ва ўласным іх значэнні. Праводзячы такія назіранні, абітурыенты могуць самастойна канструяваць састаўныя выказнікі, правільна ўжываць іх у маўленні і выконваць адпаведныя заданні.

Пры вывучэнні тэмы "Сказы з аднароднымі членамі" граматычнае значэнне аднародных членаў павінна асэнсоўвацца праз выяўленне злучальнай сувязі паміж кампанентамі, спецыфічнай інтанацыі і аднолькавай сінтаксічнай функцыі. Навучэнцы павінны ўсвядоміць, што сувязь паміж аднароднымі членамі заўсёды забяспечваецца спецыяльнымі граматычнымі сродкамі: спецыфічнай інтанацыяй і/ці злучальнымі злучнікамі.

Пры вывучэнні адасобленых членаў сказа неабходна засвоіць паняцце аб адасабленні на аснове інтанацыі, структуры адасобленага члена, яго функцыі ў сказе, пазіцыі; зразумець семантыка-стылістычныя асаблівасці сказаў з адасобленымі членамі; навучыцца выкарыстоўваць іх у вуснай і пісьмовай мове і правільна ставіць знакі прыпынку. Прычым тлумачэнню новага

матэрыялу павінны папярэднічаць практыкаванні, якія дапамогуць абагульніць ужо вядомае навучэнцам аб такіх канструкцыях.

Пры вывучэнні адасобленых членаў галоўная ўвага, як і пры вывучэнні аднародных членаў, павінна накіроўвацца на выкананне інтанацыйна-граматычных і сэнсава-інтанацыйных практыкаванняў. Ды і само паняцце адасаблення ўсведамляецца як інтанацыйнае выдзяленне даданых членаў з мэтай надаць ім большую самастойнасць і сэнсавую значнасць у сказе.

Такая арганізацыя матэрыялу стварае базу ўсведамлення навучэнцамі ўзаемасувязей паміж вывучаемымі з'явамі мовы, іх іерархічнай залежнасці. Сучасная методыка выкладання сінтаксісу арыентуе на разгляд вывучаемай канструкцыі ў адзінстве трох яе бакоў: значэння, моўных сродкаў яго выражэння (формы) і функцыі (прызначэння). Напрыклад, спалучэнне дзейніка і выказніка характарызуецца значэннем прэдыкатыўнасці. Гэтае значэнне выражаецца такімі сродкамі мовы, як пэўныя словаформы, іх граматычная сувязь, парадак размяшчэння, інтанацыя. Прызначэнне гэтага спалучэння – служыць граматычнай асновай сказа. Адасобленыя члены сказа адрозніваюцца значэннем паўпрэдыкатыўнасці (дадатковага паведамлення). Сродкі выражэння гэтага значэння – пэўныя марфалагічныя формы, парадак іх размяшчэння, інтанацыя. Прызначэнне адасаблення – падкрэсліць, выдзеліць сэнсавую функцыю спалучэння слоў ці асобнага слова ў адносінах да іншых слоў у сказе.

У вывучэнні сінтаксісу простага сказа трэба абавязкова выдзяляць галоўныя, самыя важныя пытанні і акцэнтаваць на іх увагу, пастаянна паўтараць іх у сувязі з вывучэннем іншага сінтаксічнага матэрыялу. У вывучэнні простага сказа такімі галоўнымі момантамі, на нашу думку, з'яўляюцца, па-першае, уважлівае знаёмства са структурай сказа і сістэмай словазлучэнняў, з якіх складаецца просты сказ; па-другое, старраннае вывучэнне тыпаў простага сказа; па-трэцяе, уменне правільна інтанаваць і ставіць патрэбныя знакі прыпынку. Далейшае асэнсаванне новых сінтаксічных ведаў, у першую чаргу пра складаны сказ, і фарміраванне на іх аснове ўменняў і навыкаў (у тым ліку і пунктуацыйных) поўнасцю залежыць ад таго, як навучэнцы разбіраюцца ў структуры і семантыцы простага сказа.